# Апавяданне «Мая Беларусь»

**Касач Уладзіслава,**
**ДУА "Гімназія №1 г. Баранавічы,**
**5 клас**

Каця сядзела ля стала і нешта малявала. Гэта была звычайная дзяўчынка, якую кожны з вас можа сустрэць на вуліцы свайго горада альбо вёскі. Гераіня майго апавядання пражывае ў Баранавічах.

Каця любіць маляваць. Яе аднагодкі звычайна малююць лялек, аднак Каця больш за ўсё любіць маляваць родныя краявіды.

А ў Баранавічах ёсць што маляваць. У Кацiным альбоме шмат малюнкаў. Ёсць тут і малюнак, які называецца «Помнік вераб'ю».

Так, сапраўды, у Баранавічах ёсць такі помнік. З'явіўся ён у горадзе ў 2003 годзе. Аднойчы малая гуляла з матуляй і ўбачыла гэты помнік . Ён вельмі спадабаўся Кацярынцы. Не прайшло і некалькі дзён, як малая ўжо паказвала родным свайго вераб'я. Маці тады сказала, што больш такіх помнікаў ў нашай краіне няма.

А не так даўно Кацярына была ў весцы ў бабулі і пабачыла, што прыляцелі буслы. Пагэтаму і сядзела яна з алоўкам у руках: малявала дрэва, на якім яны павінны былі будаваць гняздо. Дзяўчынка шчыра працавала, таму не заўважыла як хутка прайшоў час. Хутка павінен быў прыйсці са школы Коля, яе старэйшы брат. Недзе ў суседнім пакоі была маці, якая таксама чакала Мікалая.

Прайшло яшчэ некалькі хвілін, і ў акне з'явілася постаць школьніка. Каця адразу заўважыла, што брацік вяртаецца са школы вясёлым. Калі хлопчык увайшоў у хату, Кацярынка кінулася да Колі са сваім малюнкам.

- Паглядзі. Я бусloў намалявала, − весела пачала тараторыць малая.
- Ужо паспела? – здзівіўся Коля.
- Ага. Мама казала, што яны з Афрыкі вярнуліся на сваю радзіму.
- Вядома, буслы, як і мы, людзі, любяць сваю Бацькаўшчыну.
- Якое дзіўнае слова "Баць-каў-шчы-на", - сказала Каця. – А што гэта такое?
- Гэта тая зямля, якая засталася нам ад нашых бацькоў, − па-дзіцячы патлумачыў Коля. – А ім ад іх бацькоў –нашых дзядоў. І так аж да самых далёкіх продкаў. А яшчэ нам сёння ў школе казалі, што бусел − сімвал нашай краіны, нашай Беларусі.
- Бе-ла-ру-сі? – зноў па складаў паўтарыла Каця. – А чаму гэта яна белай завецца?
- Адны кажуць, што ад белага колеру вопраткі і светлага колеру валасоў тых людзей, якія ў ей жывуць. Іншыя сцвярджаюць, што белая – значыць вольная, так нам настаўніца казала, − з задавальненнем адказаў Мікалай. Ен быў рады падзяліцца сваімі ведамі з сястрой.
- А я думала, што мая Беларусь сіняя, чырвоная, жоўтая, зяленая. Мне здавалася, што ў ёй шмат колераў.

− Што шмат, то шмат, − чухаючы патыліцу разважаў Коля.

У гэты час у пакой увайшла маці. Пачуўшы дзіцячу размову, яна сказала, што раз бусел – сімвал Беларусі, то і Беларусь павінна заставацца белай.

Потым Каця пайшла ў свой пакой і прынесла альбом. Разлажыўшы ўсе малюнкі, яна весела загаварыла:

− Мама, Коля, паглядзіце, якая прыгожая наша краіна! Як я рада, што мая Беларусь – самая цудоўная краіна ў свеце. Я заўсёды буду любіць сваю Бе-ла-русь. Я заўсёды буду яе маляваць.

Усё шчыра ўсміхнуліся. Маці падышла да сваёй дачушкі, пагладзіла яе валасы і пяшчотна пацалавала Кацю. Недзе глыбока ў душы яна ганарылася тым, што Кацярынка расце сапраўдным патрыётам.